# ЗАПІСКА М.К. АГІНСКАГА АЛЯКСАНДРУ І У КАНТЭКСЦЕ АДРАДЖЭННЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ВКЛ

*А.Ф. Вішнеўскі, Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь*

Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай шляхта былога ВКЛ не жадала мірыцца з інкарпарацыяй краіны ў склад Расійскай імперыі. На землях княства, пачынаючы з паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі стаў афармляцца вызваленчы рух, галоўнай мэтай якога было адраджэнне дзяржавы абодвух народаў у межах 1772 г.

Адзначым, што не толькі Напалеон Банапарт умела гуляў на патрыятычных пачуццях палякаў, калі ў 1807 г. утварыў Герцагства Варшаўскае. Такую палітыку ў адносінах да арыстакратыі і шляхты далучаных губерняў праводзіў і Аляксандр І. Праекты адраджэння Рэчы Паспалітай ён абмяркоўваў з Адамам Чартарыйскім у 1804, 1806 і 1809 гг. Расійскі імператар заяўляў аб жаданні аднавіць падзеленую краіну, даць ёй ліберальную канстытуцыю па прыкладу Канстытуцыі 3 мая 1791 г. пры ўмове, што адноўленая дзяржава будзе дынастычна звязаная з Расіяй. Калі імператар прапанаваў Чартарыйскаму разгледзець пытанне аб утварэнні ВКЛ, апошні не пагадзіўся абмяркоўваць яго, спасылаючыся на сваю некампетэнтнасць.

У той жа час пэўнае кола памешчыкаў Беларусі і Літвы, зыходзячы з рэальных суадносін сіл на еўрапейскай арэне, узяло курс на падтрымку Аляксандра І. Асноўнай мэтай гэтай групоўкі было адраджэнне дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага ў форме аўтаноміі, уключаючы тэрыторыю Беларусі і Літвы з сталіцай у Вільні. Пасля меркавалася аб’яднанне з Вялікім герцагствам Варшаўскім у адноўленай Рэчы Паспалітай. Такая палітыка арыентацыі на Расію была абумоўлена расчараваннем шырокіх колаў шляхты былой Рэчы Паспалітай у Напалеоне, які стварыў Вялікае герцагства Варшаўскае, цалкам падпарадкаванае сабе, і прадэманстраваў адсутнасць зацікаўленасці ў адраджэнні Рэчы Паспалітай. Наадварот, Аляксандр І ішоў насустрач пажаданням зпольшчаных памешчыкаў Беларусі і Літвы, на землях якіх часткова захаваліся ранейшыя законы, дзейнічаў Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., у адміністратыўных і судовых установах, у адукацыйнай справе панавала польская мова. Данесці да расійскага імператара спадзяванні беларуска-літоўскай шляхты ўзяўся вядомы палітычны дзеяч ВКЛ, буйны землеўладальнік, славуты кампазітар, аўтар папулярнага паланезу “Развітанне з Радзімай”, граф Міхал Клеафас Агінскі (1765-1833).

М. Агінскі займаў выдатнае месца ў палітычным жыцці Рэчы Паспалітай у апошняе дзесяцігоддзе яе існавання. Ён быў дэпутатам чатырохгадовага сойма (1788-1792 гг.), на якім была прынята Канстытуцыя 3 мая 1791 года, а таксама шэраг найважнейшых законаў, якія мелі на мэце пераўтварэнне Рэчы Паспалітай у краіну буржуазнай дэмакратыі. Быў ён і паслом апошняга ў незалежнай Рэчы Паспалітай Гродзенскага сойму. У 1793-1794 гг. займаў пасаду падскарбія вялікага літоўскага. Падчас паўстання 1794 года на чале з Т. Касцюшкам, Агінскі знаходзіцца ў складзе сфарміраванных у ходзе паўстання органаў улады Беларусі і Літвы. За свой кошт ён укамплектаваў батальён конных егераў, камандаваў імі ў некалькіх бітвах. Пасля падаўлення паўстання эмігрыраваў за мяжу. Жыў у Вене,

Венецыі, Парыжы. У 1802 годзе вярнуўся на радзіму. У 1810 г. М. Агінскі атрымаў званне сенатара. У красавіку 1811 г. ён па уласнай ініцыятыве сустрэўся з Аляксандрам I, які прапанаваў Агінскаму падрыхтаваць пісьмовы праект адраджэння дзяржаўнасці ВКЛ. Асноўны змест плана Агінскага і яго аднадумцаў быў выкладзены ў мемарыяльнай запісцы, пададзенай Аляксандру I 15 мая 1811 г. і праекце ўказа аб новай арганізацыі заходніх губерняў.

У «запісцы» М. Агінскі нагадвае, што літвіны заўсёды «клапаціліся пра свае правы і былі верныя сваім манархам, адзначаліся мужнасцю і любоўю да бацькаўшчыны». Нягледзячы на ўнію з Польшчай, гордыя сваім паходжаннем, ліцвіны «захавалі свае звычаі, свой цывільны кодэкс, мясцовае кіраванне, сваё войска, вярхоўны суд, міністраў, дзяржаўных чыноўнікаў і нават сойм, які збіраўся па чарзе ў Варшаве і Гародні»[2, с. 207]. Агінскі спрабуе перадаць расійскаму імператару сваю ўпэўненасць у тым, што ў выпадку аднаўлення старажытнай беларуска-літоўскай дзяржавы Расійская імперыя атрымае прыхільнае насельніцтва, і імкненне Напалеона, у выпадку ваенных дзеянняў, перацягнуць яго на свой бок, будзе безвыніковым.

У адпаведнасці з прапановамі, выказанымі ў "запісцы" па загаду Аляксандра I М. Агінскім быў падрыхтаваны "праект указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў". Ім прадугледжвалася ўтварэнне з Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай і Валынскай губерняў разам з Беластоцкай і Тарнопальскай акругамі адной правінцыі пад назвай Вялікае княства Літоўскае. Кіраванне ВКЛ даручалася імперскаму намесніку. Сталіцай Княства абвяшчалася Вільня. Непасрэдным органам кіравання імперскай адміністрацыі ў краі прадугледжвалася Літоўская канцылярыя пад кіраўніцтвам аднаго з дзяржаўных міністраў. Унутранная адміністрацыя ВКЛ засяроджвалася ў Адміністрацыйнай радзе кіравання пад старшынствам імператарскага намесніка. Усе сябры рады прызначаліся імператарам.

Статутам ВКЛ павінны былі вызначацца арганізацыя і кампетэнцыя ўсіх галін унутранага кіравання: размеркаванне падаткаў, кіраванне дзяржаўнай маёмасцю, набор і ўтрыманне войска, паліцыі, дзейнасць пошты, шляхоў зносін, юстыцыі, народнай адукацыі, земляробства і прамысловасці. Захоўваўся Трыбунал ВКЛ, як вышэйшая судовая інстанцыя. Усе пасады ў дзяржаўным кіраванні прадугледжвалася замяшчаць толькі ўраджэнцамі Вялікага княства. Ліцвіны ўраўноўваліся ў падатках і спосабах іх спагнання з іншымі губернямі імперыі [3, с. 212-213].

Аднак, выпрацоўка і абмеркаванне планаў адраджэння Вялікага княства Літоўскага выклікала варожасць нацыянальна-кансерватыўных колаў расійскага грамадства. Па-першае, таму, што яны глядзелі на землі ВКЛ як на "исконно русские", і ў стварэнні княства бачылі замах на цэласнасць і недатыкальнасць Расіі. Па-другое, яны баяліся аслаблення краіны ў выніку яе расчлянення напярэдадні ваеннага сутыкнення з Напалеонам. На баку праціўнікаў праекта былі такія аўтарытэтныя ў Расіі асобы як гісторык Карамзін, "маладыя сябры" імператара Строганаў і Навасільцаў, дарадца Сперанскі, дзяржаўны сакратар Шышкоў. Самастойна Аляксандр I не адважыўся ажыццявіць задуманыя планы і па сутнасці ў пачатку 1812 г. адмовіўся ад ідэі аднаўлення ВКЛ пад апекай Расіі. З пачаткам франка-рускай вайны 1812 года патрыятычная групоўка ў Вільні

абвясціла ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага. Аднак Напалеон не дазволіў далучыць да яго Віцебскую і Магілёўскую губерні, абмежаваўшы тэрыторыю толькі Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губернямі. З мясцовых ураджэнцаў у дэпартаментах (губернях), субпрэфектурах (паветах) і кантонах (валасцях) была ўтворана адміністрацыя. Але яе дзейнасць абмяжоўвалася спагнаннем падаткаў і рэквізіцый як з памешчыкаў, так і з сялян з мэтаю задавальнення патрэб французскай арміі. Падобная палітыка Напалеона адштурхнула большасць магнатаў і шляхты ад французскай вайсковай і мясцовай грамадзянскай улады. Паводле пастаноў Венскага Кангрэса 1815 года Аляксандр I атрымаў частку Польшчы ў якасці аўтаномнай адзінкі ў складзе Расійскай імперыі. Яшчэ адна аўтаномія на землях Беларусі і Літвы яму ўжо не была патрэбна. Як вынік, Аляксандр і адказаў князю Чартарыйскаму, сябру сваёй маладосці, што рускіе дваране “ніколі не дапусцяць, каб Літва, Валынь, Падолія зноў адышлі да Польшчы” [1, с. 199].

Літаратура:

1. Грыцкевіч А. Памятныя запіскі Міхаіла Клеофаса Агінскага Аляксандру I у 1811 годзе. / А. Грыцкевіч // Адраджэнне: гістарычны альманах. Вып. 1. Мн., 1995.
2. Запіска графа Агінскага, пададзеная Аляксандру I 15 мая 1811 г.// Адраджэнне: гістарычны альманах. Вып. 1. Мн., 1995.
3. Праект указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў. // Адраджэнне: гістарычны альманах. Вып. 1. Мн., 1995.